Источник: "Веды" - 2013-06-24

# Даследчык гісторыі трох народаў



**14 чэрвеня ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа НАН Беларусі адбылася прэзентацыя ўнікальнай выстаўкі, прысвечанай нашаму знакамітаму земляку, – «Мітрафан Доўнар-Запольскі – даследчык гісторыі трох народаў». Працы беларускага этнографа і гісторыка, літаратура пра яго жыццё і дзейнасць, успаміны сучаснікаў, кнігі з асабістага збору навукоўца – гэтыя ды іншыя ўнікальныя творы і дакументы ўтрымлівае экспазіцыя.**

М.Доўнар-Запольскі – аўтар больш за 150 прац, прысвечаных гісторыі сялянскіх рухаў, эканамічным пытанням, этнаграфіі. Вядомы выкладчык і прафесар працаваў у Мінску, Баку, Кіеве, Маскве, Харкаве. Ён стаяў ля вытокаў беларускай нацыянальнай ідэі, што не аднойчы падкрэслівалася падчас імпрэзы. Акрамя таго, у 20-30-х гадах прошлага стагоддзя Доўнар-Запольскі займаў пасады ў сістэме кіравання гаспадаркай у савецкіх Украіне, Азербайджане, Беларусі і Расіі.

Лёс яго не быў простым – падчас Грамадзянскай вайны ў шэрагах Чырвонай арміі загінулі абодва яго сыны, а ў 1926 годзе навукоўца быў вымушаны з'ехаць з роднай краіны ў Маскву пасля забароны рукапісу яго кнігі «Гісторыя Беларусі», і ўжо да самой смерці ў 1934 годзе ён так і не вярнуўся на Радзіму.

На пачатку прэзентацыі ўдзельнікам паказалі фільм пра Доўнара-Запольскага. У цэлым на выстаўцы ЦНБ НАН Беларусі прадставіла каля 100 дакументаў XVIII-XXI стагоддзяў са сваіх фондаў. Гэта працы навукоўца, у тым ліку прыжыццёвыя выданні, кнігі з асабістага кнігазбору з аўтографамі і пячаткамі. Вельмі зацікавілі прысутных матэрыялы з асабістага архіва вядомага беларускага гісторыка і археографа М.Улашчыка. Успаміны і фотаздымкі даюць магчымасць вачыма маладога чалавека «паглядзець» на Доўнара-Запольскага падчас яго знаходжання ў Мінску.

Акрамя таго, у экспазіцыі ўтрымліваюцца копіі дакументаў з Санкт-Пецярбургскага філіяла Архіва РАН, Цэнтральнага дзяржаўнага гістарычнага архіва Украіны, Дзяржаўнага архіва Кіева, Нацыянальнай бібліятэкі Украіны імя У.І.Вярнандскага, Нацыянальнага архіва Беларусі, Цэнтральнага навуковага архіва НАН Беларусі, прычым многія з гэтых дакументаў былі прадстаўлены ўпершыню і толькі ў дзень адкрыцця выстаўкі.

Усе дакументы падзелены паводле асаблівасцей жыцця Доўнара-Запольскага на чатыры часткі: 1) копіі дакументаў, прысвечаныя кіеўскаму перыяду (аб адукацыі навукоўца, характарыстыкі з мест навучання і т.д.), 2) матэрыялы аб дзейнасці ў Мінску ад запрашэння Доўнара-Запольскага на працу і да не вельмі прыемных дакументаў, якія сведчаць аб забароне публікацый яго кнігі і неабходнасці пакінуць беларускую сталіцу, 3) ліставанне Доўнара-Запольскага з дзеячамі навукі і культуры, 4) матэрыялы, якія адносяцца да абрання яго акадэмікам АН СССР.

Выступаючы на адкрыцці выстаўкі, акадэмік-сакратар Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў НАН Беларусі Аляксандр Каваленя адзначыў важнасць таго факта, што «мы пакрыху вяртаем з небыцця асоб, хто зрабіў шмат дзеля таго, каб нітка жыцця беларускага народа ніколі не перарывалася». Ён прапанаваў працягнуць працу па збору і публікацыі архіўных дакументаў, якія ўтрымліваюцца ў Беларусі і за мяжой і датычацца дзейнасці Доўнара-Запольскага. Дырэктар Інстытута гісторыі НАН Беларусі Вячаслаў Даніловіч адзначыў, што, акрамя ўсяго, М.Доўнар-Запольскі быў адным з заснавальнікаў беларускай гістарычнай навукі. «Яго жыццёвы шлях – гэта прыклад таго, як чалавек упарта і паслядоўна імкнуўся да абранай жыццёвай мэты і вельмі шмат паспеў зрабіць на гэтым шляху», − лічыць В.Даніловіч.

**Васіліна МАЦУТА**
**Фота аўтара, «Веды»**